**КАСЦЕ́НІЧ** Ерафей Васілевіч (16.10.1854, в. Мужычок Хоцімскага р-на Магілёўскай вобл. — 6.1.1906), вучоны ў галіне афтальмалогіі. Д-р медыцыны (1887), праф. (1893). Скончыў Пецярбургскую ваен.-мед. акадэмію (1883). З 1894 праф. Варшаўскага ваен. шпіталя, з 1900 заг. вочнай клінікі і дырэктар вочнай лячэбніцы ў Пецярбургу.

У час адпачынкаў бясплатна лячыў і рабіў хірург. аперацыі сялянам на Беларусі. Навук. працы па пытаннях афтальмалогіі. Удасканаліў шэраг афтальмалагічных аперацый.

*Тв.*: Развитие палочек, колбочек и наружного ядерного слоя в сетчатке зародыша человека. СПб., 1887.

**Касценіч Ерафей Васільевіч // Беларуская энцыклапедыя** : у 18 т. — Мінск, 1999.— Т. 8 : Канто—Кулі. — С. 159—160.